редакцией доктора исторических наук, профессора В.Г. Шадурского. – МИНСК. ИЗДАТЕЛЬСТВО «ЧЕТЫРЕ ЧЕТВЕРТИ», 2015. С. 9-11.
3.Аврех, А.Я. Распад третьеиюньской системы / А.Я. Аврех. – Москва. Издательство Наука, 1985. – 259 с.
4. Бондаренко, К. М. Правые партии и их организации в Беларуси (1905-1917 гг.): монография / К.М. Бондаренко. – Могилев: УО МГУ им. А.А. Кулешова, 2010.– 412 с.
5.Бусько, С. І. Палітычная паліцыя ў беларускіх губернях: стварэнне, структура, дзейнасць (1898 - сакавік 1917 г. ): дыс. … канд. гіст. навук. –Мінск : БДУ, 2011. – 153 с.
6. Документы и материалы по истории Белоруссии (1900-1917 гг.); Академия наук Белорусской ССР, Институт истории; под ред. В.Н. Перцева. – Минск, изд-во Академии наук БССР, 1953. – Т.3. – 1020 с.
7.Правые партии. Документы и материалы: в 2-х тт. / сост.: Ю.И. Кирьянов. – М.: Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН), 1998. – Т.2. 1911-1917 гг. – 816 с.
8.Булацель, П.Ф. Борьба за правду. П.Ф. Булацель / Т. 1. Переиздание СПб., 1995. – 488 с.
9. Первая Всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. Т. XIII. Могилевская губерния. Б. м., 1903. Издательство ЦСК МВД. – 133 с.
10. Гавриков, А.В. Общественно-политическая правомонархических организаций и партий в Российской империи 1907-1910гг./ А.В. Гавриков // «XXI ҒАСЫР ЕУРАЗИЯ КЕҢІСТІГІНДЕГІ ГУМАНИТАРЛЫҚ ҒЫЛЫМЫНЫҢ ЖЕТІСТІКТЕРІ МЕН МӘСЕЛЕЛЕРІ».: I Халықар. ғыл.-тәж. интернет конф. Материалдары / Құраст.: Ұ.Ү. Үмітқалиев, З.Ө. Ибадуллаева, Қ.Қ. Сарсембина, т.б.– Астана, 2015. – С. 60–64.
11. Міхедзька, В. А. Улада і «чарнасоценцы» ў Беларусі ў пачатку XX ст.: праблема ўзаемадачыненняў / В.А. Міхедзька // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого педагогические науки : сб. науч. ст. : в 2 ч. / под ред. В. Ф. Беркова. – Минск: РИВШ, 2009. Вып. 8(13). Ч. 1. – С. 128-134.

**С.В. Мяньчэня, Мінск (Беларусь),**
**Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны універсітэт**

## УСТАНОВЫ МАГІЛЁЎСКАГА ПАВЯТОВАГА ПАПЯЧЫЦЕЛЬСТВА АБ НАРОДНАЙ ЦВЯРОЗАСЦІ (1897-1914 ГГ.)

З 1894 года ў Расійскай Імперыі пачала рэалізоўвацца палітыка дзяржаўнай манаполіі на вытворчасць і продаж моцных алкагольных

напояў, адначасова з гэтым дзяржава абвесціла курс на абмежаванне спажывання алкагольных напояў і барацьбу з п’янствам. З 1 ліпеня 1897 года ў Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях у выніку правядзення рэформы былі створаны камітэты папячыцельства аб народнай цвярозасці. Іх асноўнай мэтай было правядзенне мерапрыемстваў па арганізацыі здаровага вольнага часу насельніцтва, абмежаванне празмернага п’янства, нагляд за нелегальным продажам алкаголя і прапаганда здаровага ладу жыцця. Губернскія камітэты папячыцельства аб народнай цвярозасці ствараліся пад кіраўніцтвам губернатараў, у іх падпарадкаванні знаходзіліся павятовыя камітэты на чале з мясцовымі прадвадзіцелямі дваранства. У склад камітэтаў уваходзілі прадстаўнікі фактычна ўсіх ведамстваў: царквы, сістэмы адукацыі і здравааховы, жандармерыі, суда і войска, чыноўнікі казённай, акцызнай і кантрольнай палаты. Гэта давала камітэтам значныя магчымасці, але з іншага боку пераўтварала іх у бюракратычныя арганізацыі, члены якіх, часцей за ўсё былі занятыя на асноўным месцы службы.

Асноўным відам устаноў папячыцельстваў аб народнай цвярозасці былі чайныя і народныя дамы. Чайная павінна была стаць месцам, дзе можна было правесці вольны час, пагутарыць, дзе ў адрозненні ад дома людзі знаходзілі чысціню і камфорт. Акрамя арганізацыі продажу напояў і закусак, павінна была стаць месцам здаровага і карыснага адпачынку, дзякуючы настольным гульням, музычным інструментам, грамафонам, газетам і народным чытанням. Планавалася, што ў выпадку паспяховай дзейнасці народныя чайныя стануць фінансава самастойнымі ўстановамі і не будуць залежыць ад дзяржаўнай падтрымкі і прыватных ахвяраванняў. Поспехі дзяржаўных чайных прывялі б да ўзнікнення падобных прыватных устаноў. Як вынік, распаўсюджанне спажывання чая павінна было прывесці да скарачэння спажывання алкаголя [1, с.13].

Асноўнай мэтавай аўдыторыяй лічылісь прадстаўнікі “простага народу” – сяляне і рабочыя. Разлічвалася, што заможныя людзі маюць магчымасць піць чай дома, і ў чайную дзеля гэтага не пойдуць. Але пры гэтым наведваць чайную мог кожны з мэтай адпачыць, абагрэцца, схавацца ад дажджу, пры гэтым плата з яго не ўзымалася, а персанал чайной не мог перашкодзіць гэтаму, дазвалялася таксама спажываць прынесеныя з сабою ежу і напоі [2, арк.141]. Кожны жадаючы мог бясплатна наведаць чайную і з мэтай чытання газет і часопісаў, якія знаходзіліся тут у свабодным доступе. Перыядычныя выданні выпісваліся за кошт губернскага камітэта. Наведвальнікі маглі азнаёміцца з мясцовымі губернскімі ведамасцямі і іншымі часопісамі і газетамі (“Вокруг света”, “Крестьянское хозяйство”, “Русский паломник”), спіс якіх вывешваўся на сцяне. Таксама на сценах чайной вывешваліся плакаты з правіламі гігіены і здаровага ладу жыцця, урадавыя пастановы (у чайных актыўна распаўсюджваліся матэрыялы, якія

тлумачылі сэнс мерапрыемстваў рэформы П. Сталыпіна), рэкамендамыі па ўладкаванню гаспадаркі (карысць травасеяння, выкарыстання ўгнаенняў, замежны вопыт) [3, арк.3,15]. Таксама пры большасці чайных ствараліся бібліятэкі і чытальні, якія маглі выдаваць кнігі па абанементу на дом.

У Магілёве камітэтам было арганізавана тры чайныя: №1 з начлежным домам на Шклоўскім рынку (1.11.1897), №2 на Быхаўскім рынку і № 3 ў Маскоўскім прадмесці (25.11.1897) [4, арк.18,19,25]. У павеце першыя чайныя з'явіліся ў мястэчках Бялынічы (14.10.1897), Княжыцы (15.06.1898), Круглае (1.07.1898), Шклоў (кастрычнік 1898), вёсцы Вендарож (1.01.1900) [4, арк.15-17,26,27].

У 1899 г. камітэт выкупіў зямельны надзел разам з домам па Петрапаўлаўскай вуліцы ў Лупалове. Пасля капітальнага рамонту тут быў адчынены народны дом папячыцельства. Там размесцілася чайная, канцэртная зала на 500 месцаў, дзе праходзілі народныя спектаклі і чытанні, бібліятэка-чытальня, дзе дазвалялася як чытаць кнігі на месцах, так і браць на дом, начлежны прытулак на 5 пакояў з навесам для вазоў і коней. У садзе вакол дома арганізоўваліся народныя гулянні з фейерверкамі, дзіцячымі гульнямі і выступленнем аркестраў [5, арк.56-57].

Тэатральная трупа складалася з аматараў, якія гралі бязплатна, адзіным прафесіяналам быў рэжысёр, прафесійны актор Падбярэскі. Білеты на спектаклі каштавалі ад 7 да 80 кап., аднак публіка ў асноўным выкупляла толькі танныя білеты, астатнія высылаліся ў выглядзе запрашэнняў. У антракце публіку забаўляў духавы аркестр з мясцовага сіроцкага дома [5, арк.56]. Калі спектакляў не было, у залі праходзілі бясплатныя чытанні з чароўным ліхтаром.

Прыбытак чайным павінны быў проносіць продаж прадукцыі, аднак і тут надзеі арганізатараў не спраўдзіліся. Асартымент чайных не адрозніваўся разнастайнасцю і складаўся з чая і халодных страў, акрамя гэтага чайныя ажыццяўлялі продаж тытуню, папірос, канцэлярскіх тавараў і марак. Адна порцыя чая у сярэднім каштавала ад 4 да 6 капеек. Наведвальнік атрымліваў два чайніка з кіпятком, 2 - 3 кавалка цукра і пакет з чаем, запячатаны загадчыкам чайной. Прыгатаваць напой трэба было самостойна, буфетчыкам і сідзельцам заварваць чай кліентам катэгарычна забаранялася, каб пазбегнуць крадзяжу і падману кліента. Дадатковы цукар і чай павінны былі аплачвацца асобна [2, арк.141]. Пры гэтым колькасць кіпня і асоб на адну порцыю была неабмежавана і ў сярэднім складала 5 - 6 чалавек. Прадугледжваўся таксама і продаж чая кубачкамі за 1 капейку, што было разлічана на бедных кліентаў і тых, хто не меў дастаткова часу.

Асноўны кантынгент чайных складалі: з раніцы - рабочыя, вечарам – гандляры і рамеснікі, у базарныя дні з 12 да 16 гадзін – сяляне. Чайныя працавалі з 7 да 23 гадзін, напярэдадані святаў і святочных дзён да 18 гадзін, а ў святочныя дні з 12 гадзін [6, арк.65]. У абавязак сідзельцаў і

загадчыкаў чайных уваходзіў падлік наведвальнікаў, што адлюстроўвалася ў штогадовых справаздачах.

Першапачаткова інтарэс насельніцтва да чайных, як да новай з'явы, быў дастаткова вялікі. Але асноўнае іх прызначэнне было не зусім зразумела. Так, у Княжыцах папячыцель Міхаіл Кадрэвіч арганізоўваў гутаркі з сялянамі аб карысці чая і на першы раз частаваў іх за свой кошт [7, арк.24ад.]. З цягам часу народныя чайныя не вытрымлівалі канкурэнцыі з корчмамі і прыватнымі ўстановамі. Згодна з захаваўшыміся дадзенымі можна прасачыць дынаміку наведвання чайных у Магілёўскім павеце ў 1899-1905 гг. [8,9 Прыкладанне №6; 10-12, Форма №3б]:

| Год | Колькасць чайных | Агульная колькасць наведвальнікаў | Сярэдняя колькасць наведвальнікаў на 1 чайную |
|---|---|---|---|
| 1899 | 9 | 234031 | 26003 |
| 1900 | 10 | 300961 | 27360 |
| 1902 | 9 | 217264 | 24140 |
| 1903 | 9 | 183919 | 20435 |
| 1905 | 8 | 139974 | 17496 |

Як бачна энтузіязм першых год паступова ідзе на спад, а рэвалюцыйныя падзеі 1905 г. прывялі чайныя да заняпаду.

Вясной і летам ў час сельска-гаспадарчых работ чайныя гублялі амаль усіх кліентаў, а некаторыя, каб не несці фінансавыя страты, увогуле зачыняліся. Аднак і тыя, хто наведваў чайныя, вялікіх прыбыткаў не прыносілі. Як пазначалася ў справаздачы Чэрыкаўскага павятовага камітэта ў 1903 г.: "Галоўны элемент наведвальнікаў чайных складаюць сяляне, якія ходзяць у чайныя для гутаркі і чытання, чая патрабуюць вельмі мала, каб не губляць працоўную капейку на пустую справу, як яны завуць спажыванне чая" [11, с. 10].

Яшчэ адной праблемай устаноў папячыцельства стала адсутнасць уласных памяшканняў, у такіх умовах верагоднасць іх прыбытковасці значна зніжалася. З 9 чайных Магілёўскага павятовага камітэта 1 знаходзілася ў памяшканні камітэта (у народным доме), 1 – без арэнднай платы (дом святара Мікалая Мігая у Круглым), 7 – у наёмных [8, Прыкладанне №6]. Кошт арэнды быў розным: арэнда ў Шклове складала 300 руб. у год, Бялынічах – 140 руб., чайная №2 у Магілёве – 450 руб., чайная №1 разам з начлежкай – спачатку 900, а затым 800 руб. [5, арк.52, 57-58].

Ва ўмовах руска-японскай вайны і рэвалюцыйных падзей 1905 г. фінансаванне папячыцельстваў рэзка скарачаецца. Каб пазбегнуць вялізных выдаткаў было прынята рашэнне зачыняць чайныя ў сельскай мясцовасці на летні перыяд, калі сяляне, занятыя гаспадарчымі работамі, амаль не наведвалі ўстановы камітэта, але губернатар дадзенай прапановы

не падтрымаў [13, арк.38ад]. Камітэт вымушаны быў пайсці на іх поўную ліквідацыю. Захаваўся ліст сялян Круглянскай воласці ў губернскі камітэт з нагоды закрыцця чайной у сакавіку 1906 г. Звяртаючыся да губернатара сяляне прасілі захаваць для іх чайную і пазначалі: "…закрыць чайную, значыць пазбавіць нас духоўнай ежы і света і ададаць ў рукі яўрэяў…зноў будзем шукаць прытулку ў яўрэйскіх прытонах, дзе нас будуць абдзіраць. Было так добра: зойдзеш у чайную, убачыш тут святую ікону, паслухаеш чытанні, якія тут праводзяцца і з задавальненнем ідзеш дадому" [13, арк.16, 17].

У гэтых абставінах была праведзена рэвізія ўстаноў павятовага камітэта. Высветлілася, што пасада кіраўніка камітэта, з'яўляецца вакантнай, а сам камітэт не мае нават карты мясцовасці з пазначэннем участкаў і сваіх ўстаноў. Большасць членаў камітэта актыўна ў яго працы не ўдзелічала, а аб некаторых увогуле адсутнічала інфармацыя. Вендарожская чайная была зачынена ў сакавіку 1906 г. і перададзена прыватнай асобе для арганізацыі гандлю па правілах камітэта, падобная прапанова была зроблена святару М. Мігаю, для захавання Круглянскай чайной. З прапановай перадаць чайную ў прыватныя рукі звярнуліся ў камітэт і некалькі жыхароў Шклова. Застаўшыеся чайныя, былі знойдзены ў занядбаным стане і прыносілі толькі выдаткі. [5, арк. 51]. Музычныя інструменты не працавалі, бібліятэкамі ніхто не карыстаўся, народныя чытанні праводзіліся толькі ў чайной №1 Магілёва і зрэдку ў Бялынавічскай чайной. Начлежка пры чайной №1 карысталася дурной славай сярод мясцовагв насельніцтва, асноўнымі яе наведвальнікамі былі мясцовыя бяздомныя, воры і п'яніцы, сяляне з-за пагрозы жыццю і маёмасці імкнуліся не набліжацца да яе [13, арк.9].

Па выніках рэвізіі быў прапанаваны план актывізацыі дзейнасці камітэта і змяншэння выдаткаў. Зачыніць платныя бібліятэкі, а кнігі перадаць у народны дом, плату за карыстанне кнігамі адмяніць, каб бібліятэка камітэта магла вытрымаць канкурэнцыю з боку іншых устаноў, увесці абавязковы ўлік чытачоў, пазначаючы іх узрост, пол, канфесію і род заняткаў. Адрамантаваць памяшканні праблемных чайных, ці знайсці новыя, дзеля павышэння прыбытку чайных арганізаваць абавязковы продаж баранак, булак, халодных закусак, тытуня, папірос, запалак і паштовых марак. Навесці парадак ў начлежцы на Шклоўскім базары, і недапускаць абкрадвання наведвальнікаў. Ліквідаваць пасаду касіра ў народным доме, а яго функцыі ўскласці на загадчыка ці бібліятэкаршу. Што датычыцца перадачы чайных прыватным асобам, то тут губернскі камітэт выказаўся, што такая практыка з'яўляецца недапушчальнай [5, арк.49-50].

Аднак рэалізаваць дадзены план камітэт не здолеў. З-за недахопу фінансавання з 1 мая 1907 г. былі зачынены чайныя ў Шклове і Бялынічах. Ніхто з мясцовых членаў камітэта не пагадзіўся ўзяць на сабе працу па іх

функцыянаванню. У Круглым святар М. Мігай здолеў захаваць чайную з фінансаваннем ад камітэта ўсяго за 100 руб. у год [14, арк.28]. Цікавая сітуацыя склалася вакол народнай чайной №1 на Шклоўскім базары. Каб павысіць прыбытковасць, камітэт прымае рашэнне аб ліквідацыі начлежкі. Уладальнік дома Іофэ у адказ выказаўся, што ў такім выпадку ён адмаўляецца трымаць у сваім доме чайную, але калі начлежка будзе захавана, то ён гатовы знізіць арэндную плату з 800 да 450 руб. у год [14, арк.18]. Аб тым, чым так цікавіла домаўладальніка гэта неблаганадзейная ўстанова, застаецца толькі дагадвацца. Між тым камітэт не прыняў прапановы Іофэ, зусім адмовіўся ад начлежнага дома і чайной і перадаў іх разам з маёмасцю гарадскім уладам [14, арк.18].

Такім чынам народны дом стаў фактычна адзінай установай папячыцельства аб народнай цвярозасці. У лістападзе 1907 г. Магілёўскі аддзел саюза рускага народа прапанаваў перадаць яму народны дом, бо камітэт не спраўляецца са сваімі абавязкамі, і дом не выконвае сваіх функцый. Але ў дадзеным выпадку на баку камітэта быў закон, згодна з адказам губернскага камітэта народнага дома Саюзу рускага народа была не дапушчальнай з прычыны таго, што Саюз, як палітычная арганізацыя, будзе выкарыстоўваць дадзеную пляцоўку ў сваіх мэтах [14, арк.28].

Камітэт распачаў капітальны рамонт дома, які не дазволіў яму функцыянаваць у поўную моц. Тэатральная зала была зачынена, чайная перанесена пад навес, а яе загадчык выконваў яшчэ і функцыі вартаўніка. Пад час гарадскога пажару 6 чэрвеня 1911 г. у 3-яй частцы Магілёва комплекс народнага дома быў фактычна знішчаны. З усіх пабудоў захаваліся толькі сцены каменнага дому і фундамент начлежкі, сад вакол дома выгарэў. Значна была пашкоджана маёмасць камітэта: інвентар чайной, тэатральны рэквізіт, цалкам была знішчана бібліятэка [15, арк.14]. У далейшым народны дом таксама праследваў злы лёс: пад час рамонту галоўны інжынер зламаў нагу і мог кантраляваць ход працы, пасля завяршэння работ былі выяўлены значныя недахопы. Не працавала сістэма ацяплення, ды і сам рамонт быў неякасны, справа нават дайшла да суда і, як вынік, завяршыць рамонтныя работы да 1914 г. камітэт так і не здолеў [15, арк.54].

Установы папячыцельстваў аб народнай цвярозасці павінны былі стаць новымы цэнтрамі жыцця насельніцтва, яны павінны былі сумясціць у сябе рысы эфектыўнай камерцыйнай установы і месца культурна-асветніцкай дзейнасці. Сярод прычын, якія не далі рэалізавацца гэтаму праэкту, можна назваць наступныя: бюракратызацыя працэсу адкрыцця і ўтрымання чайной, даволі часта прыватная ініцыятыва гінула з-за недасканаласці заканадаўства; невялікі асартымент прапануемай прадукцыі, шмат якія чайныя не маглі прапанаваць сваім кліентам нічога акрамя чая і “духоўнай ежы” і таму не маглі скласці канкурэнцыю пітным установам. Беднасць не дазваляла простым людзям успрымаць ідэю

перахода на чай усур'ёз, і да пачатку Першай сусветнай вайны ўстановы Магілёўскага павятовага камітэта папячыцельства аб народнай цвярозасці фактычна перасталі існаваць.

Крыніцы і літаратура:
1. Значение чайных в борьбе с алкоголизмом. – Санкт-Петербург, 1903. – 21 с.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 2555. – Воп. 1. – спр. 113.
3. НГАБ. – Фонд 2296. – Воп. 1. – спр. 8.
4. НГАБ. – Фонд 2296. – Воп. 1. – спр. 2.
5. НГАБ. – Фонд 2296. – Воп. 1. – спр. 5.
6. НГАБ– Фонд 2709. – Воп. 1. – спр. 2.
7. НГАБ. – Фонд 2296. – Воп. 1. – спр. 1.
8. Отчёт Могилёвского попечительства о народной трезвости за 1899 год. – Могилёв, 1900. – 79 с.
9. Отчёт Могилёвского попечительства о народной трезвости за 1900 год. – Могилёв, 1901. – 70 с.
10. Отчёт Могилёвского попечительства о народной трезвости за 1902 год. – Могилёв, 1903. – 11 с.
11. Отчёт о деятельности Могилёвского попечительства о народной трезвости за 1903 год. – Могилёв, 1904. – 47 с.
12. Отчёт о деятельности Могилёвского попечительства о народной трезвости за 1905 год. – Могилёв, 1907.. – 61 с.
13. НГАБ. – Фонд 2296. – Воп. 1. – спр. 4.
14. НГАБ. – Фонд 2296. – Воп. 1. – спр. 7.
15. НГАБ. – Фонд 2296. – Воп. 1. – спр. 11.

**М.В. Громыко, г. Могилев (Беларусь),**
**Могилевский государственный областной институт развития образования**

## ГАЗЕТА «МОГИЛЕВСКИЙ ВЕСТНИК» В 1906–1917 ГГ.

Для губернской администрации в переходное в политическом отношении время «Могилевский вестник», был необходимым, как печатный орган, «правильно» освещающий правительственные распоряжения и события местной жизни. Губернское правление, хотело иметь местный орган печати, «носящий характер официоза», для распространения особенно среди крестьянского населения «правдивых разного рода сведений» [1, л. 3 об.].

Могилевский губернатор Николай Михайлович Клингенберг решил расширить неофициальную часть «Могилевских губернских ведомостей»,